КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

# Замест кантэйнераў — машыны «адказных таварышаў»

**У Гаранскім сельсавеце прыём грамадзян па асабістых пытаннях правяла старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў Юлія БЯЛЯНКІНА. Спектр праблем, якія хвалююць людзей, дастаткова шырокі, паведамляе газета Мінскага раёна «Прысталічча».**

Напрыклад, бацька шматдзетнай сям'і, у якой да таго ж выхоўваецца і дзіця-інвалід, Сяргей Лагвіненка, прасіў растлумачыць, ці мае ён права выкупіць дом, дзе жыве яго сям'я, на льготных умовах? Заяўніку дадзены адпаведныя рэкамендацыі.

Пенсіянер Аляксандр Ключнік з пасёлка Трасцоўшчына турбаваўся накont рамонту дарогі на вуліцы Школьнай. Паводле яго слоў, там толькі трэба падсыпаць друзам 50 метраў дарожнага палатна.

Зрэшты, на нездавальняючы стан мясцовых дарог скардзіліся і іншыя грамадзяне, якія прыйшлі на прыём. Неабходныя тлумачэнні з гэтай нагоды даў дырэктар ДРБУ-194 Віктар Рагускі, які прысутнічаў на прыёме.

Аляксей Жэшка і Алена Асіпенка хадайнічалі аб уключэнні інжынерных сетак жылой забудовы аграгарадка Наваселле ў план будаўніцтва, які фінансуецца з бюджэту Мінскага раёна. Ім варта паспяшацца: заявы на разгляд дадзенага пытання прымаюцца не пазней за сярэдзіну снежня гэтага года.

З 2014-га вядуць перапіску з чыноўнікамі жыхары дома № 6 на вуліцы Маладзёжнай у Наваселлі, паведаміла Ларыса Крыловіч, якая прыйшла на прыём. Людзі просяць аб адным: завяршыць рамонт даху іх дома, які так да гэтага часу і не скончаны. Між тым дом заліваюць дажджы. Па тэлефоне **дырэктар Жыллёва-камунальнай гаспадаркі Міншчыны Арцём ЯФРЭМАЎ** растлумачыў, што рамонт будзе завершаны ў пачатку наступнага года. Што і казаць, камунальнікі застрахавалі верныя сабе: шчодра раздаюць абяцанні, пра якія потым забываюцца. Паглядзім, ці стрымаюць яны слова гэтым разам.

Ларыса Крыловіч таксама ўзняла пытанне выкарыстання пяці кантэйнераў для збору камунальных адходаў. Яны выстаўлены каля яе агарода непасрэдна на зямлі, нягледзячы на тое, што побач знаходзіцца асфальтавая пляцоўка, аднак на ёй ставяць свае асабістыя машыны розныя «адказныя таварышы». Пытанне ўзята на кантроль.

А жыхара вёскі Крылава Канстанціна Вяжэвіча турбуе блытаніна ў нумарацыі дамоў раёна жылой забудовы. Гэта стварае пэўныя нязручнасці для пад'езду машын экстранных службаў: хуткай дапамогі, пажарнай, міліцыі. Навесці парадак у нумарацыі дамоў можна толькі пры ўмове, калі кожны з іх уладальнікаў звернецца ў адпаведную рэспубліканскую ўстанову.

# КРОКІ ДА ЭКАЛОГІІ

**Экалагічная адукацыя, змена спажывецкіх звычак і сартаванне адходаў ці забароны і абмежаванні на вытворчасць непрыдатнай для перапрацоўкі прадукцыі, стварэнне новых тавараў, якія могуць вырабляцца з другасных рэсурсаў, і выкарыстанне смецця як паліва. Беларусі яшчэ давядзецца выбіраць свой шлях да жыцця без адходаў...**

У найбліжэйшы час мы можам застацца без аднаразовага посуду, саломінак для кактэйляў і ватных палачак. Ва ўсялякім разе, у хуткім часе яны знікнуць у Еўрасаюзе. І гэта толькі адзін з крокаў па барацьбе з пластыкам.

За апошнія пяцьдзясят гадоў ужыванне пластыку ў Еўропе павялічылася ў 20 разоў. Сінтэтычныя палімеры, танныя і зручныя для спажыўцоў, замянілі паперу, дрэва, шкло. Пры гэтым значна сталі прырастаць звалкі, пераважна дзякуючы аднаразовай упакоўцы. І калі Еўропа пачала тануць у смецці, якое аказалася складана, а то і немагчыма перапрацаваць, экологі забілі трывогу. У адказ на іх выступленні ў Еўрасаюзе былі прыняты адпаведныя заканадаўчыя акты і распрацавана цэлая стратэгія па абыходжанні з адходамі. Натуральна, адна з асноўных задач, якую трэба вырашаць сёння, — скарачэнне вытворчасці пластыку, які не можа быць перапрацаваны.

Зразумела, Беларусь не зможа застацца ўбаку і нам давядзецца таксама вырашаць «пластыкавую праблему». Напэўна, нашым вытворцам ужо цяпер варта падумаць пра альтэрнатыву сінтэтычным палімерам. А спажыўцам пачаць прызвычайвацца абыходзіцца хаця б без таго ж аднаразовага посуду і поліэтыленавых пакетаў.

Шмат намаганняў да барацьбы з адходамі прыкладаюць беларускія экалагічныя арганізацыі. Часам іх праекты, якія пачыналіся як валанцёрская справа, перарастаюць у экалагічны бізнес. Пры гэтым яны спрабуюць адвучыць беларусаў ад дрэнных, «экалагічна недружалюбных» звычак.

Сацыялагічнае апытанне, праведзенае Цэнтрам экалагічных рашэнняў, паказала, што 55 працэнтаў беларусаў маюць у сваёй шафе адзенне, якое надзявалася ўсяго пару разоў. Але незапатрабаваным рэчам можна знайсці прымяненне. Так, дабрачынны магазін «Калі ласка» прымае непатрэбнае адзенне і перадае людзям, якія трапілі ў складанае матэрыяльнае становішча.

Сацыялагічнае апытанне таксама засведчыла, што 39 працэнтаў жыхароў краіны выкідаюць рэшткі ежы. І гэта эканомныя беларусы! Ужо з'явілася ініцыятыва «Мінскі кошык», якая працуе з гэтай праблемай. Актывісты прыдумалі, што рабіць з рэшткамі ежы, пратэрмінаванымі прадуктамі і таварамі супермаркетаў, тэрмін прыдатнасці якіх хутка скончыцца.

Актывісты паклапаціліся і пра тое, як абараніць спажыўца ад лішніх пакупак. Напрыклад, каб павесіць карціну, зусім не абавязкова набываць дрыль, яе можна ўзяць у бібліятэцы інструментаў.

Хутка знайшлася альтэрнатыва поліэтыленавым пакетам. Так, сёння можна не толькі набыць тканінавыя торбы і спецыяльныя шматразовыя фасовачныя пакецікі, але і самім навучыцца іх шыць (праект «ТорбаШоу»).

Усе вышэй згаданыя ініцыятывы скіраваныя на тое, каб мяняць паводзіны спажыўца, адвучаць яго ад тавараў, якія потым запаўняюць нашы сметнікі. Але многія людзі адразу змогуць пераключыцца на экалагічна дружалюбны лад жыцця?

Пакуль гаварыць пра татальную «экасвядомасць» насельніцтва не даводзіцца. Нават прывучыць людзей збіраць адходы асобна аказалася не так проста. Многія яшчэ не даносяць другасныя рэсурсы да каляровых кантэйнераў. Некаторыя пры гэтым заяўляюць: «Навошта сартаваць, калі ўсё смецце забірае адна машына?» Насамрэч змесціва каляровых кантэйнераў пасля трапляе на сартавальныя пункты, і ад 20 да 80 працэнтаў яго ідзе на перапрацоўку. З агульных жа кантэйнераў можна пусціць у справу не больш за 10 працэнтаў адходаў.

## ШТО РАБІЦЬ?

Шмат намаганняў, накіраваных на пераўтварэнне адходаў у другасныя рэсурсы, робіцца дзяржорганамі. Пытанне, прысвечанае гэтай тэме, будзе разглядацца на парламенцкіх слуханнях у наступным годзе. Але сёння варта задумацца і над тым, што рабіць, каб звычайныя жыхары маглі дапамагаць у вырашэнні «смеццевых» пытанняў, якіх, на жаль, менш не становіцца. Як змагацца з несанкцыянаванымі звалкамі? Што перашкаджае людзям сартаваць адходы? Як паўплываць на вытворцаў, якія вырабляюць тавар, непрыдатны для перапрацоўкі? Каму і як перашкаджае смецце? І якія шляхі для вырашэння такіх праблем бачаць нашы чытачы? «МС» усіх запрашае да дыскусіі.

*Дасылайце свае меркаванні ў рэдакцыю на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск з паметкай «для «МС». Ці на электронны адрас: info@zviazda.by.*

*А яшчэ мы прапануем чытачам прыняць удзел у нашай экалагічнай апытанцы на сайце zviazda.by. Кожны тыдзень мы будзем падводзіць яе вынікі і змяняць пытанні, каб даведацца, наколькі «экасвядомыя» нашы чытачы.*

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

***Ці хвалюе вас праблема бытавога смецця?***

- Так.
- Не.
- Не задумваўся аб гэтым.

***Што для вас найбольш значнае ў вырашэнні праблемы ўтылізацыі смецця?***

- Забруджванне планеты.
- Чысціня ў двары / у горадзе.
- Яшчэ адна магчымасць зарабіць грошы.

***Што неабходна зрабіць для таго, каб паўсюдна ўвесці раздзельны збор смецця?***

- Павышаць агульную культуру людзей, тлумачыць, для чаго гэта трэба.
- Павялічыць колькасць дворнікаў.
- Ставіць больш спецыяльных кантэйнераў.
- Быць патрабавальнымі да сябе і членаў сям'і.

***У якім населеным пункце вы жывяце?***

- Мегаполіс (сталіца, абласны горад).
- Невялікі раённы горад.
- Пасёлак, аграгарадок, вёска.

***Ваш узрост***

- 15—20 гадоў.
- 20—30 гадоў.
- 30—45 гадоў.
- 45—60 гадоў.
- 60+.







МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 22 лістапада 2018 года.**